Весці БДПУ. Серыя 1. 2017. № 4. С. 123–127.

*УДК 82–92(476.7)*

# ЖАНРАВАЯ ПАЛІТРА МЯСЦОВЫХ ВЫДАННЯЎ ВА ЎМОВАХ ТРАНСФАРМАЦЫІ СУЧАСНАЙ МЕДЫЯПРАСТОРЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ РАЁННЫХ ГАЗЕТ БРЭСТЧЫНЫ)

**А. І. Кунахавец-Плявака,**
*аспірант кафедры перыядычнага друку Інстытута журналістыкі БДУ*

Паступіў у рэдакцыю 13.10.17.

*UDC 82–92(476.7)*

# GENRE PALETTE OF THE LOCAL EDITION UNDER THE TERMS OF THE TRANSFORMATION OF MODERN MEDIA SPACE (ON THE MATERIALS OF TO THE BREST REGIONAL NEWSPAPERS)

**A. Kunakhavets-Pliavaka,**
*postgraduate student of department of periodicals of the Institute of journalism of the Belarusian State University*

Received on 13.10.17.

У артыкуле разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця жанравай сістэмы сучаснай журналістыкі. Тлумачыцца паняцце «жанр», вызначаюцца ключавыя прыкметы жанравай дыферэнцыяцыі газетных тэкстаў. Аналізуецца жанравая палітра раённых выданняў з улікам трансфармацыі сучаснай медыяпрасторы. Эмпірычная база даследавання ўключае матэрыялы рэгіянальных выданняў, заснавальнікамі якіх выступаюць раённыя выканаўчыя камітэты, а таксама раённыя Саветы дэпутатаў Брэсцкай вобласці. Прадстаўлены рэзультаты кантэнт-аналітычнага даследавання жанравай дыферэнцыяцыі прэсы паўднёва-заходняга рэгіёна нашай рэспублікі. Абгрунтоўваецца тэзіс аб тым, што на ўзровень папулярнасці і прэстыжу, даверу з боку жыхароў раёна, на тыраж і запатрабаванасць рэгіянальных выданняў уплываюць самыя разнастайныя фактары, сярод якіх і форма падачы матэрыялаў, іх жанравая разнастайнасць.

*Ключавыя словы:* жанр; жанравая палітра выдання; мясцовыя выданні; раённая газета; трансфармацыя; медыяпрастора.

The basic tendencies of development of the system genre of modern journalism are considered in this article. The concept of «genre» is explained, the key features of genre differentiation newspaper texts are determined. The genre palette of regional publications is analyzed taking into account the transformation of modern media space. The empirical base of research materials include regional publications, the founders of which are the district executive committees and district councils of deputies of the Brest region. The results of the content of analytical studies of genre differentiation press of the south-western region of our country are represented. The article justifies the idea that the level of popularity and prestige and the confidence of the inhabitants of the district, on the circulation and demand for regional media is influenced by various factors, among which is the form of feed materials, their genre diversity.

*Keywords:* genre; genre palette of editions; local editions; local newspaper; transformation; media space.

Сістэма жанраў сучаснай беларускай журналістыкі знаходзіцца ў стане няспыннай трансфармацыі. Паскораны рытм жыцця, інфармацыйны бум XXI стагоддзя дыктуюць выкарыстанне новых форм падачы матэрыялаў, адпаведна змяняецца і жанравая палітра СМІ.

Праблема жанравай спецыфікі журналісцкіх тэкстаў застаецца, бадай што, адным з самых актуальных напрамкаў развіцця навуковай думкі ў сучаснай журналістыцы. Тэорыю жанраў паранейшаму хвалююць пытанні вызначэння самога паняцця «жанр», яго функцый і ўстойлівых характарыстык. Жанравай сістэме СМІ постсавецкага перыяду прысвечаны працы такіх вядомых расійскіх навукоўцаў, як А. А. Цяртычны, Л. Я. Кройчык, М. М. Кім, Г. В. Лазуціна, С. С. Распапова і інш. Сярод айчынных даследчыкаў варта адзначыць імя стваральніка беларускай навуковай школы ў галіне тэорыі журналістыкі, доктара філалагічных навук, прафесара Б. В. Стральцова. Тэме трансфармацыі журналісцкіх жанраў свае навуковыя працы прысвячалі Т. Д. Арлова, Л. П. Саянкова, А. А. Градзюшка, В. М. Самусевіч, Н. В. Туміловіч, Л. В. Скібіцкая і інш.

Чаму ж праблема жанравай класіфікацыі газетных матэрыялаў да гэтай пары лічыцца досыць складанай і выклікае такую цікавасць з боку навукоўцаў? Істотныя змены ў жыцці сучаснага грамадства, з аднаго боку, і барацьба за чытацкую аўдыторыю – з другога, падштурхоўваюць журналістаў да актыўнага пошуку эфектыўных спосабаў структурна-стылістычнага ўзбагачэння газетных жанраў. Аднак вырашэнне праблемы жанравай класіфікацыі сучаснага друку ўскладняе не столькі тыпалагічная і функцыянальна-стылістычная разнастайнасць тэкстаў сучасных СМІ,

колькі тое, што сёння пытанне аб жанравай прыналежнасці многіх газетных публікацый складана вырашыць адназначна.

«Сённяшні дзень айчыннай журналістыкі адзначаны з'явай, якая называецца змешваннем (узаемапранікненнем) жанраў. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што жанравыя адрозненні журналісцкіх матэрыялаў праяўляюцца ў інфармацыйных патоках усё менш заўважна і слаба адчуваюцца не толькі аўдыторыяй, але і прафесійным асяроддзем» [1, с. 3]. Так, напрыклад, А. А. Цяртычны ў сваёй кнізе «Жанры перыядычнага друку» вылучае 35 публіцыстычных жанраў. Акрамя традыцыйных жанравых форм вучоны разглядае аналітычнае апытанне, сацыялагічнае рэзюмэ, анкету, маніторынг, рэйтынг, сатырычны каментарый, жыццёвую гісторыю, легенду, прагноз, версію, эксперымент і інш. Больш таго, некаторыя навукоўцы гавораць аб існаванні не менш як чатырох соцен газетных жанраў.

Таму, перш чым прыступіць да аналізу жанравай палітры раённых выданняў, варта спыніцца на інтэрпрэтацыі самога паняцця «жанр» (ад франц. genre – «род, від»), якое сёння таксама пераасэнсоўваецца ў кантэксце сучасных уяўленняў аб функцыянаванні сродкаў масавай інфармацыі. Агульнапрынятым у тэорыі журналістыкі лічыцца вызначэнне жанра як «устойлівай групы публікацый, аб'яднаных падобнымі змястоўна-фармальнымі прыкметамі» [2]. Гэтая шырока вядомая дэфініцыя не выклікае нараканняў, паколькі жанры заўсёды захоўваюць свае родавыя прыкметы, хоць часам яны і церпяць мадыфікацыі. Аднак, на наш погляд, вышэйадзначанае вызначэнне ўсё ж такі неабходна ўдакладніць: вытрыманае ў гістарычных традыцыях, яно пакуль што цалкам абстрагавана ад «чалавечага фактару» – важнага складніка сучаснай журналісцкай творчасці.

«Сучасная журналістыка ўсё больш выразна персаніфікуе. Аўтар перастае быць абязлічаным рэтранслятарам перадаваемай інфармацыі – ён усё выразней становіцца яе інтэрпрэтатарам» [3]. Сапраўды, пункт гледжання канкрэтнай асобы (аўтара) сёння цікавы сам па сабе. Персаніфікацыя тэксту выкліканая да жыцця не толькі агульным працэсам дэмакратызацыі постсавецкага грамадства, але і тым, што ва ўмовах існуючага цяпер рынку інфармацыі таварам становіцца не проста навіна, а «навіна, "спакаваная" ў публіцыстычны тэкст». На наш погляд, у кантэкст новых навуковых уяўленняў аб СМІ вельмі ўдала ўпісваецца дэфініцыя публіцыстычнага жанру, прапанаваная Л. Я. Кройчыкам: «публіцыстычны жанр – гэта адносна ўстойлівая структурна-змястоўная арганізацыя тэксту, абумоўленая своеасаблівым адлюстраваннем рэчаіснасці і характарам адносін да яе творцы» [3].

Цікавасць выклікае і пазіцыя Г. В. Лазуцінай і С. С. Распопавай – аўтараў падручніка «Жанры журналісцкай творчасці», якія звязваюць паняцце «жанр» не з тэкстам, а з цэласным уяўленнем аб творчай дзейнасці. «Для нас жанр – не тып тэксту, не група тэкстаў, што валодаюць устойлівымі змястоўна-фармальнымі прыкметамі, а від пэўнай творчасці, адзначаны ўстойлівымі асаблівасцямі не толькі на ўзроўні прадукту (тэкст), але і на ўзроўні спосабу дзейнасці» [1, с. 8].

Доктар філалагічных навук, прафесар Б. В. Стральцоў вызначае чатыры асноўных прыкметы жанравай дыферэнцыяцыі. Па-першае, жанры адрозніваюцца па мадыфікацыях прадмета, характару аб'екта адлюстравання. Па-другое, жанры маюць канкрэтнае прызначэнне. Па-трэцяе, жанрам уласцівы розны маштаб вывадаў і абагульненняў. І, нарэшце, жанры адрозніваюцца па характары моўна-стылістычных сродкаў, альбо, іншымі словамі, эмацыянальна-вобразнай насычанасці [4, с. 17–18].

Як бачым, у тэорыі журналістыкі пакуль што не склалася адзінага меркавання адносна паняцця «жанр». Таму ў сваіх навуковых працах адны даследчыкі па-ранейшаму прытрымліваюцца традыцыі дзялення газетных публікацый на тры групы – інфармацыйныя, аналітычныя і мастацка-публіцыстычныя (А. А. Цяртычны). Іншыя, наадварот, прынцыпова ад гэтай традыцыі адмаўляюцца, лічачы абстрактны прынцып дамінанты якой-небудзь адной уласцівасці – інфармацыйнасці, аналітычнасці ці вобразнасці – непрымальным (Л. Я. Кройчык). Дарэчы, з падачы апошняга, гаворачы пра матэрыялы СМІ, тэарэтыкі і практыкі журналістыкі пачалі ўжываць паняцце «тэкст», што аб'ядноўвае маўленчыя творы розных жанраў, але пры гэтым не ўлічвае іх адметных асаблівасцей [3]. Апошнім жа часам увогуле ўсё часцей выкарыстоўваецца паняцце «гіпертэкст» – новы феномен медыяпрасторы, які ствараецца не толькі сродкамі друкаваных СМІ, але і інтэрнэтам.

Якой жа будзе жанравая палітра сродкаў масавай інфармацыі ў недалёкай будучыні? Па меркаванні А. А. Цяртычнага, у значнай меры гэта залежыць ад вынікаў узаемадзеяння двух адносна самастойных жанравых структур, якія сёння прысутнічаюць на старонках сучаснай прэсы. «Першая ўяўляе сабой устойлівую сукупнасць жанраў, якія фарміраваліся ў ходзе гістарычнага развіцця айчыннай журналістыкі (як у дарэвалюцыйны час, так і ў савецкі перыяд). Другая – сукупнасць жанраў, якія выкарыстоўваюцца ў замежных СМІ. Яна пераносіцца на нашу глебу разам з іншымі элементамі вопыту рыначных адносін, што пераймаюцца з Захаду». Аднак, падкрэслівае даследчык, нават самае павярхоўнае параўнанне асаблівасцей жанравай палітры айчыннай і заходняй журналістыкі паказвае, што «другая больш простая (што добра), але ў той жа час больш прымітыўная, больш шаблонная, чым першая (што дрэнна)» [5].

Падводзячы вынікі даследавання жанравай дыферэнцыяцыі зместу раённых газет Брэстчы-

ны, можна зрабіць выснову: на старонках мясцовых выданняў вядучае месца займаюць кароткія і дэталізаваныя нататкі (ад 51,7 % у «Навінах Палесся» да 70,05 % у газеце «Раённыя будні»); справаздачы аб мерапрыемствах, якія праводзяцца ўладнымі структурамі горада і раёна (ад 1,5 % у «Навінах Камянеччыны» да 9,24 % на старонках «Івацэвіцкага весніка»); замалёўкі аб працаўніках вёскі, лепшых прадстаўніках сваёй прафесіі і проста неардынарных і таленавітых людзях раёна (ад 2,7 % у камянецкай «раёнцы» да 8,5 % у столінскай); інтэрв'ю з кіраўнікамі рэгіёна, мясцовай элітай (ад 0,7 % на старонках «Палескай праўды» да 8,46 % у «Навінах Камянеччыны»).

Дамінуючую пазіцыю на старонках раённых газет традыцыйна займае найпрасцейшы жанр перыядычнага друку – нататка. Асноўнае яе прызначэнне – паведамленне аб тым, што, дзе, калі адбылося ці павінна адбыцца. Да такога тыпу публікацый можна аднесці матэрыял «Праздник единоборств в Столине», апублікаваны пад рубрыкай «З месца падзеі» («Навіны Палесся» ад 7 сакавіка 2017 года). Адказы на пытанні «што? дзе? калі?» дадзены адразу ў першым абзацы матэрыяла: «4 марта 2017 года в нашем замечательном городе Столине прошло спортивное мероприятие, посвященное 100-летию белорусской милиции. ФСК «Аквамарин» принял более 150 каратистов на трёх татами из Минска, Гомеля, Бреста, Пинска, Барановичей, Мозыря, Иваново и Столинского района». Далей аўтар сцісла расказвае аб двух напрамках правядзення спаборніцтва, яго арганізатарах і, урэшце, знаёміць чытачоў з вынікамі, якіх дасягнулі прадстаўнікі Століншчыны. Здаецца, такая падзея магла б па праву стаць асновай рэпартажа з падрабязным апісаннем этапаў спаборніцтва, уражаннямі і перажываннямі яго ўдзельнікаў, аўтарскім успрыманнем таго, што адбываецца, аднак на старонках газеты з'явілася толькі пашыраная нататка. Больш таго, пры асвятленні спаборніцтва рэспубліканскага маштабу журналіст акцэнтуе ўвагу толькі на жыхарах свайго раёна, падрабязна пералічваючы прозвішчы і імёны кожнага з іх. Такія падыходы характэрны для многіх мясцовых выданняў: тлумачыцца ўсё тым, што чытачам «раёнкі» было б не так цікава чытаць газету, калі б там яны не змаглі ўбачыць інфармацыю пра сябе, сваіх сяброў і калег. Адсюль такая ўвага мясцовых газетчыкаў да пераліку ўсіх імён удзелкаў мерапрыемстваў.

Досыць падрабязна і аб'ёмна на старонках газет асвятляюцца пасяджэнні раённых выканаўчых камітэтаў і раённых Саветаў дэпутатаў, якія традыцыйна выступаюць у ролі заснавальнікаў мясцовых выданняў. Амаль усе гэтыя матэрыялы падаюцца ў форме справаздач, якія займаюць па плошчы не менш як адну паласу выдання. Пры гэтым часта ўвогуле такія матэрыялы ў якасці галоўнай тэмы выносяцца на першую паласу. («Итоги 2016 года и подготовка к весенне-полевым работам были рассмотрены на заседании райисполкома» – «Янаўскі край» ад 3 сакавіка 2017 года; ***«Пинский райисполком уделяет значительное внимание теме обращений граждан»*** – «Полесская правда» ад 22 лютага 2017 годаі інш.). На жаль, і сёння, пасля адмены партыйнай манаполіі на сродкі масавай інфармацыі, створаная як інструмент улады, «раёнка» захоўвае рысы афіцыёзнага выдання. Газетныя старонкі звычайна перагружаны звесткамі з афіцыйных інстанцый, інтэрв'ю з кіраўніцтвам рэгіёна, чыноўнікамі, справаздачамі з пасяджэнняў, семінараў (рубрыкі: «Улада – для людзей», «Парады спецыяліста», «Актуальная тэма», «Чалавек і грамадства», «У райвыканкаме» і г. д.). Замест таго каб друкаваць праблемныя і дыскусійныя матэрыялы, публікацыі пра людзей, рэдакцыі вымушаны займаць плошчу выданняў афіцыйнымі пастановамі, рашэннямі райвыканкамаў. Такое становішча тлумачыцца эканамічнай залежнасцю ад заснавальнікаў і негатыўна адбіваецца на аўтарытэце самой газеты.

На жаль, у чыстым выглядзе на старонках раённых выданняў вельмі складана знайсці рэпартаж – інфармацыйны жанр, які «дакладна, выразна і дынамічна малюе карціну падзеі праз непасрэднае ўспрыяцце аўтара, што абавязкова прысутнічае на месцы дзеяння і стварае «эфект прысутнасці» для чытачоў [4, с. 67]. Часцей можна сустрэць матэрыялы з яго элементамі. Падставай для напісання такіх публікацый, як правіла, выступаюць падзеі, што маюць рэзананс не толькі ў раёне, у вобласці, але і ў цэлым у рэспубліцы. Інфармацыя аб такіх мерапрыемствах традыцыйна выносіцца на першую паласу выдання, тэкст суправаджаецца вялікай колькасцю фотаздымкаў, апытаннямі ўдзельнікаў падзей. Так, на старонках іванаўскай «раёнкі» (да лютага бягучага года газета выходзіла пад назвай «Чырвоная звязда», сёння гэта – «Янаўскі край» – *заўвага аўтара*) публікуецца шмат матэрыялаў, напісаных ў форме справаздачы з элементамі рэпартажа («Гостеприимным "Мотальскім прысмакам" и жара не стала помехой» – «Чырвоная звязда» ад 14 жніўня 2015 года; «Ой, дай, Божэ, нам, дай жыто жаты, Шоб за год усім дожынкы дождаты... » – «Чырвоная звязда» ад 30 жніўня 2016 года і інш.).

Сваёй вобразнасцю і эмацыйнасцю прываблівае рэпартаж з палёў ***«Живу, наслаждаюсь, болею работой...»*** («Янаўскі край» ад 7 красавіка 2017 года). Дзякуючы непасрэднай прысутнасці аўтара на месцы падзей («День *нашего визита* в хозяйство был благоприятным для полевых работ… Со стороны спрятанного в солнечном мареве горизонта *навстречу нам* величественно движется сверхмощный "Кейс" с присоединенным к нему восьмикорпусным плугом, оставляя за собой свежевспаханную полосу шириной более трех метров»), аперыраванню аўтарскім «я»

(«Любуюсь солнечными бликами, которые бегут вслед за прокладываемой бороздой, отсвечивая ее бархатистую черноту, вдохновенными обветренными лицами аграриев». «Землю солнце красит, – подумалось, – а человека труд») ствараецца «эфект прысутнасці» для чытачоў. Перадаецца дынаміка падзей (у тым ліку і за кошт фотаздымкаў, якія суправаджаюць тэкст), адчуваецца атмасфера асаблівага працоўнага настрою аграрыяў.

Бадай што, адным з самых распаўсюджаных інфармацыйных жанраў, які ўзялі на ўзбраенне журналісты раённых газет, з'яўляецца інтэрв'ю. Рубрыкі «Актуальнае інтэрв'ю», «Цікавы суразмоўца», «Інтэрв'ю з нагоды» ёсць на старонках кожнай «раёнкі». Часам у такіх матэрыялах прысутнічаюць элементы аналітыкі. Асаблівай разнавіднасцю гэтага дыялагічнага жанру з'ўляецца апытанне. У адрозненне ад інтэрв'ю, мэта якога – атрыманне адказаў на некалькі (часам – мноства) пытанняў ад аднаго чалавека, у ходзе апытання журналіст спрабуе атрымаць адказы на адно і тое ж пытанне ад мноства людзей (рубрыка «Вопрос один – ответов много» на старонках «Янаўскага краю», «Наш опрос» – у «Навінах Палесся», «Апытанне» на старонках камянецкай «раёнкі», «Ваш голас» – у «Івацэвіцкім весніку» і інш). Як правіла, мэта такіх публікацый – прыцягнуць да шырокага абмеркавання сацыяльныя групы, магчымасць інфармацыйнага ўплыву на якія па тых ці іншых прычынах абмежавана (прадпрымальнікі, студэнты, маладыя спецыялісты, пенсіянеры).

Асаблівай папулярнасцю ў журналістаў «Навін Камянеччыны» карыстаецца «пытанне – адказ» – інфармацыйны жанр, які ў свой час узялі на ўзбраенне журналісты газеты «Аргументы і факты». Супрацоўнікі мясцовага штотыднёвіка адвялі матэрыялам дадзенага тыпу цэлую паласу. «Менавіта гэтыя тэксты ў найбольшай ступені адпавядалі інфармацыйным чаканням аўдыторыі. Будучы кароткімі па форме, яны ў той жа час былі больш выйгрышнымі, чым інфармацыйныя матэрыялы іншых жанраў. Выйгрышнасць гэтая заключаецца ў іх «зацыкленасці» на тых праблемах, што больш за ўсё займаюць увагу найбольш актыўнай часткі аўдыторыі, якая не шкадуе сваіх сіл звярнуцца ў рэдакцыю, каб атрымаць неабходную актуальную для іх (а таксама і для многіх іншых чытачоў) інфармацыю» [2]. Як паказвае практыка, да пытальна-адказнай формы тэксту журналісты звяртаюцца не толькі тады, калі іх падштурхоўваюць да гэтага чытачы. Часам трэба проста апублікаваць неабходную інфармацыю, арганізаваўшы такім чынам «інфармацыйную нагоду». Аднак у гэтым павінна быць мера: адна справа, калі ў такіх матэрыялах змяшчаецца сапраўды карысная для чытачоў інфармацыя, іншая – калі гэтыя звесткі размяшчаюцца толькі для таго, каб запоўніць свабоднае месца на паласе.

Сярод аналітычных жанраў супрацоўнікі мясцовага друку аддаюць перавагу каментарыю – ад 6,2 % публікацый на старонках «Палескай праўды» да 12,9 % у «Янаўскім краі». Артыкул як жанр практычна знік са старонак мясцовага друку («В случае неуплаты вы будете выселены?» – «Навіны Камянеччы» ад 9 сакавіка 2017 года), калі-нікалі з'яўляюцца карэспандэнцыі («Рынок есть, а банкомат?» – «Янаўскі край» ад 17 лютага 2017 года, «Почему рынки закрыты и куда податься потребителю» – «Навіны Камянеччы» ад 30 студзеня 2016 года і інш.). Па-першае, журналістам раённых выданняў не заўсёды хапае часу на глыбокае асэнсаванне праблемы, яе аналіз: прасцей напісаць тое, што бачыў і чуў. Па-другое, каб напісаць аналітычны артыкул, трэба спачатку дасканала вывучыць праблему і толькі пасля садзіцца за працу. Па-трэцяе, тыя працэсы ў грамадстве, калі галоўным лічыцца не служэнне людзям і справе, не імкненне стаць прафесіяналам у поўным сэнсе гэтага слова, а атрыманне вялікіх заробкаў, не абышлі і рэдакцыі рэгіянальных СМІ. Навошта карпець над аналітычным матэрыялам, навошта закранаць нейкія праблемы, калі можна напісаць аб праблемах лішняй вагі, уменне з густам апранацца і пры гэтым атрымаць тыя ж грошы? Думаецца, гэтая сітуацыя характэрна не толькі для раённых газет Брэстчыны.

Як паказвае аналіз СМІ, за апошнія гады на старонках раённых выданняў значна зменшылася колькасць мастацка-публіцыстычных матэрыялаў: газеты сталі таварам, які трэба зрабіць запатрабаваным «любым спосабам». На жаль, даволі рэдка з'яўляецца нарыс: жорсткая неабходнасць эканоміць газетную плошчу дыктуе свае умовы. Мясцовая прэса напоўнена агляднымі альбо даведачнымі матэрыяламі, значную колькасць палос займае рэклама, прычым не тэкставая: сустракаюцца нумары, дзе аб'ём рэкламных модуляў і прыватных аб'яў складае 30–40 % ад агульнай плошчы выдання. Безумоўна, для з'яўлення такой колькасці нежурналісцкіх публікацый існуюць і аб'ектыўныя прычыны, галоўная сярод якіх – умацаванне фінансавага становішча рэдакцый і павышэнне рэнтабельнасці выдання. Аднак трэба мець на ўвазе: на ўзровень папулярнасці і прэстыжу рэгіянальных выданняў, даверу з боку мясцовых жыхароў, на тыраж і рэнтабельнасць газеты ўплываюць самыя разнастайныя складнікі, у тым ліку і форма падачы матэрыялаў, іх жанравая разнастайнасць, арыгінальнасць аўтарскага падыходу да апрацоўкі інфармацыі і прадстаўленні яе чытачам. Адсутнасць яркіх, жывых матэрыялаў, якія закранаюць лёсы людзей, збядняе жанравую палітру газеты і гэтым самым уплывае на яе аўтарытэт.

Пры напісанні матэрыялаў пра людзей журналісты «раёнкі» часцей выкарыстоўваюць такія жанравыя формы, як партрэтная замалёўка,

інтэрв'ю, жыццёвая гісторыя. Апошнім часам папулярнасцю ў мясцовых газетчыкаў карыстаюцца жанры эсэ і калонкі, што не выклікае здзіўлення. «Мяжа XX–XXI ст. уваходзіць у гісторыю як эпоха эсэізацыі публіцыстыкі: ад персаніфікацыі апавядання да пераводу суб'екта выказвання ў дзеючую асобу гістарычнага працэсу – толькі адзін крок. І гэты крок ужо зроблены. Свет і суб'ект, што ўспрымае гэты свет, у роўнай ступені становяцца прадметам даследавання. Публіцыст сёння адчувае сябе не пабочным назіральнікам апісаных працэсаў, а раўнапраўным іх удзельнікам. Аўтар прапануе аўдыторыі тэкст, які перастае быць роўнавялікім жанру» [3].

Як паказывае практыка, мясцовая прэса пакуль што ў большай ступені дэманструе сваю прыхільнасць да традыцыйных жанравых форм, чым, напрыклад, рэспубліканскія ці абласныя выданні. Тэндэнцыі перавагі інфармацыйных жанраў, адыход ад класічнай аналітыкі і тым больш мастацкай публіцыстыкі, на жаль, закранулі і беларускія раённыя газеты. Аднак перад журналістамі мясцовых выданняў па-ранейшаму стаіць задача не проста перадаваць інфармацыю, не толькі аналізаваць яе і шукаць каментарыі кампетэнтных асоб, але і даваць канкрэтныя парады чытачу, выхоўваць яго і арыентаваць на духоўнае самапазнанне і адраджэнне асобы.


*Літаратура*

1. *Лазутина, Г. В.* Жанры журналистского творчества / Г. В. Лазутина, С. С. Распопова. – М. : Аспект Пресс, 2011. – 320 с.
2. *Тертычный, А. А.* Жанры периодической печати: учебное пособие [Электронный ресурс] / А. А. Тертычный. – Режим доступа: http://evartist.narod.ru/text2/04.htm#% D0%B7_06. Дата доступа: 25.03.2017).
3. *Кройчик, Л. Е.* Система журналистских жанров / Л. Е. Кройчик // Основы творческой деятельности журналиста [Электронный ресурс] / под ред. С. Г. Корконосенко. – Режим доступа: http://evartist.narod.ru/text5/64.htm – Дата доступа: 25.03.2017.
4. *Стрельцов, Б. В.* Основы публицистики. Жанры : учеб. пособие // Б. В. Стрельцов. – Минск : Университетское, 1990. – 240 с.
5. *Тертычный, А. А.* Состояние и перспективы развития системы жанров российских СМИ / А. А. Тертычный // Электронный научный журнал «Медиаскоп» [Электронный ресурс]. – вып. № 4, 2010. – Режим доступа: http://mediascope.ru/node/675 – Дата доступа: 27.03.2017.

*References*

1. *Lazutina, G. V.* Zhanry zhurnalistskogo tvorchestva / G. V. Lazutina, S. S. Raspopova. – M. : Aspekt Press, 2011. – 320 s.
2. *Tertychnyy, A.A.* Zhanry periodicheskoy pechati: uchebnoye posobiye [Elektronnyy resurs] / A. A. Tertychnyy. Rezhim dostupa: http://evartist.narod.ru/text2/04.htm#% D0%B7_06. Data dostupa: 25.03.2017).
3. *Kroychik, L. Ye.* Sistema zhurnalistskikh zhanrov / L. Ye. Kroychik // Osnovy tvorcheskoy deyatelnosti zhurnalista [Elektronnyy resurs] / pod red. S. G. Korkonosenko. – Rezhim dostupa: http://evartist.narod.ru/text5/64.htm – Data dostupa: 25.03.2017.
4. *Streltsov, B. V.* Osnovy publitsistiki. Zhanry : ucheb. posobiye // B. V. Streltsov. – Minsk : Universitetskoye, 1990. – 240 s.
5. *Tertychnyy, A. A.* Sostoyaniye i perspektivy razvitiya sistemy zhanrov rossiyskikh SMI / A. A. Tertychnyy // Elektronnyy nauchnyy zhurnal «Mediaskop» [Elektronnyy resurs]. – Vyp. № 4, 2010. – Rezhim dostupa: http://mediascope.ru/node/675 – Data dostupa: 27.03.2017.